**Заключение**. Наиболее важным достижением 1930-х годов явилось формирование рабочего класса. Если до революции основными занятиями населения были скотоводство и земледелие, то ускоренная индустриализация привела к созданию класса городских рабочих, занятых в новых отраслях промышленности. В республике была практически искоренена неграмотность, существовала развитая сеть учреждений народного образования. С 1924-го по 1940-й год число рабочих, занятых в промышленности и других отраслях хозяйства, выросло с 34 до 188 тыс. человек. Однако за этот прогресс Туркменистану пришлось дорого заплатить. Десятки, а возможно, и сотни тысяч зажиточных крестьян (кулаков) погибли во время коллективизации; практически все мусульманское духовенство и значительная часть вновь образованной национальной интеллигенции стали жертвами репрессий, проходивших с середины 1930-х до 1953 года.

УДК 323.1(476)+930.1(476)

**Д. А. Крэнт**
*Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Мінск*

## ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ Ў 1930-Х ГГ.

**Уводзіны.** Інтарэс акадэмічных даследчыкаў да праблемы гісторыі нацыянальных меншасцей Беларусі акрэсліўся ў міжваенны перыяд. Найбольш інтэнсіўна яна распрацоўвалася ў 1930 гады, аднак у канцы адзначанага перыяду даследаванні, прысвечаныя іншанацыянальным групам у БССР, спыніліся. У дадзенай рабоце пастаўлена мэта высветліць падыходы да вывучэння адзначанай праблемы і выявіць прычыны спынення даследаванняў па гісторыі нацыянальных меншасцей у БССР.

**Асноўная частка.** Даследаванні нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1930-х гадах адбываліся ў першую чаргу ў межах дзейнасці нацыянальных навукова-даследчых адзінак Беларускай акадэміі навук (далей — БАН). У 1931 годзе у структуры БАН існавалі латышскі, літоўскі, польскі і яўрэйскі сектары. Адзначаныя ўстановы на працягу 1930-х гадоў перажылі шэраг арганізацыйных трансфармацый, змяняючы свой статус у межах акадэміі навук. У 1932 годзе былі арганізаваны інстытуты яўрэйскай і польскай пралетарскіх культур. У наступным годзе шляхам аб'яднання адпаведных сектараў быў утвораны Інстытут літоўскай і латышскай пралетарскіх культур. Адзначаныя ўстановы ў 1935 годзе былі аб'яднаны ў Інстытут нацыянальных меншасцей. Дадзены інстытут расфарміраваны ў маі 1936-га. Гісторыка ўпамянёнай навукова-даследчай установы пасля яе рэарганізацыі размеркавалі па сектарах Інстытута гісторыі АН БССР [1, с. 209].

Уплыў на фарміраванне праблемы гісторыі нацыянальных меншасцей аказвалі іншыя навукова-даследчыя ўстановы БАН. Так, супрацоўнікам Інстытута савецкага будаўніцтва і права Я. Лушчыцкім была падрыхтавана праца па тэме «Саветы нацыянальна-польскія Дзяржынскага раёна на новым этапе». Даследчыкам Інстытута філасофіі І. Ільюшыным вывучалася праблема нацыянальнага пытання ў працах К. Маркса і І. Сталіна. Пад кіраўніцтвам дырэктара Інстытута філасофіі акадэміка С. Вальфсона распрацоўвалася тэма «Нацыянальныя асаблівасці калгаснага будаўніцтва ў БССР». Названыя вышэй супрацоўнікі Інстытута філасофіі ў 1935 годзе падрыхтавалі працу па праблеме інтэрнацыяналізму ў БССР [2, с. 234]. Такім чынам, пытанні, якія закраналі гісторыю нацыянальных меншасцей ў БССР, разглядалася і на тэарэтычным узроўні. Можна заўважыць, што менавіта даследчыкамі-тэарэтыкамі ў БССР пачала культывіравацца канцэпцыя інтэрнацыяналізму як прымальная форма нацыянальнага ўзаемадзеяння ў краіне.

Важнае значэнне пры распрацоўцы даследаванняў па гісторыі нацыянальных меншасцей Беларусі надавалася збору факталагічнага матэрыялу. Даследчыкамі пад эгідай дзейнасці нацыянальных навукова-даследчых адзінак праводзілася экспедыцыйная работа. Важнае месца займалі сацыяльна-эканамічныя экспедыцыі, задачамі якіх з'яўлялася выяўленне матэрыялаў па гісторыі фабрык, заводаў і калгасаў. Экспедыцыі падобнага характару праводзіліся латышскім сектарам ў 1930 і 1931 гадах, Інстытутам польскай пралетарскай культуры ў 1932—1934 гадах, Інстытутам яўрэйскай пралетарскай культуры ў 1931—1934-м. З гэтага шэрагу варта вылучыць экспедыцыйную працу літоўскага сектару, прадстаўнікі якога акцэнтавалі ўвагу на тым, што займаюцца зборам гаспадарчых і культурных матэрыялаў [3; 4].

Азнаямленне з працамі, прысвечанымі гісторыі нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі, дазваляе вылучыць наступныя канцэптуальныя падыходы да асвятлення адзначанай праблемы. Па-першае, значная ўвага даследчыкамі надавалася вывучэнню эканамічнага становішча насельніцтва, якое станавілася аб'ектам вывучэння. У адзначаным кірунку найбольш паказальнай з'яўлялася навуковая дзейнасць К. Шкільтэра па даследаванні латышскага насельніцтва БССР. Даследчыкам на прыкладзе гаспадарчага ўкладу латышоў была паказана прывабнасць калектыўных форм гаспадарання над індывідуалістычнымі [5].

Другім падыходам да спосабу вывучэння іншанацыянальнага насельніцтва стала асвятленне нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей. Найбольш тыповай у гэтым плане з'яўляецца праца Э. Прынца, прысвечаная нацыянальна-культурнаму будаўніцтву сярод польскага насельніцтва БССР. Аўтарам былі асветлены дасягненні, якія атрымала польскае насельніцтва БССР ад савецкага ладу [6].

© Крэнт Д. А., 2018

Трэба адзначыць, што некаторыя даследчыкі нацыянальных меншасцей Беларусі спрабавалі спалучыць адзначаныя вышэй падыходы. Прыкладам іх сінтэзу з’яўляецца праца В. Скардзіса, прысвечаная гісторыі літоўскага насельніцтва БССР [7].

Большасць работ не раскрывала пытання палітычнай актыўнасці іншанацыянальных элементаў, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі. Адзіным выключэннем у гэтым плане з’яўляюцца даследаванні, прысвечаныя яўрэйскай тэматыцы. Гэта звязана з тым, што яўрэйскія арганізацыі ў дарэвалюцыйны і паслярэвалюцыйны перыяды праяўлялі палітычную актыўнасць. У першую чаргу гэта датычыцца Бунду. Задачамі даследаванняў, якія рыхтаваліся па дзейнасці адзначанай арганізацыі, з’яўлялася адлюстраванне яе контррэвалюцыйнага характару.Трэба адзначыць, што пры стварэнні падобных даследаванняў назіралася даволі моцная самацэнзура аўтараў. Нават у падобных умовах шэраг даследаванняў здымаўся з друку. Так, быў зняты з друку падрыхтаваны даследчыкамі яўрэйскага сектару зборнік «Ленін супраць БУНДу».

Значная ўвага даследчыкамі надавалася вывучэнню рэлігійнага пытання сярод нацыянальных меншасцей. У прыватнасці, дадзеныя пытанні распрацоўваліся па польскай і яўрэйскай праблематыцы. Рабілася спроба стварыць падобнае даследаванне і па рэлігійнасці латышскага насельніцтва, аднак адзначаная ініцыятыва не была рэалізавана [4].

У межах дзейнасці навукова-даследчых адзінак БАН планавалася займацца вывучэннем не толькі вышэй памянёных нацыянальных меншасцей. У прыватнасці, узнікла ініцыятыва распачаць даследаванні па гісторыі і культуры нямецкага і татарскага насельніцтва БССР [8, арк. 37]. Варта падкрэсліць, што для рэалізацыі вывучэння культуры і гісторыі беларускіх татараў у БАН існавалі дасведчаныя кадры. Гэта тычыцца ў першую чаргу В. Вольскага, якім яшчэ ў 1920 гады была падрыхтавана серыя артыкулаў, прысвечаная татарскаму насельніцтву Беларусі, і Я. Гембіцкага, які ў 1930 годзе скончыў падрыхтоўку ў аспірантуры БАН па гісторыі культуры беларускіх татар. Аднак ініцыятыва не была рэалізавана, што можна было звязаць са згортваннем нацыянальнай палітыкі, накіраванай на развіццё нацыянальных адметнасцей асобных груп насельніцтва БССР.

На працягу адзначанага перыяду не публікаваліся работы, у якіх дзейнасць нацыянальных меншасцей разглядалася комплексна. Варта падкрэсліць, што праца ў дадзеным кірунку праводзілася. Так, у 1937 годзе да дваццацігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі планавалася выданне калектыўнага даследавання па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву сярод нацменшасцей Савецкай Беларусі. Работу рыхтаваў аўтарскі калектыў,у які ўваходзілі С. Агурскі, С. Матулайціс, В. Скардзіс, К. Шкільтэр. Азнаямленне са справаздачай В. Скардзіса аб навуковай дзейнасці за 1936 год сведчыць, што ён сумесна з К. Шкільтэрам падрыхтаваў частку работы, прысвечаную літоўскаму і латышскаму насельніцтву БССР [9, арк. 39]. Аднак у выніку памянёная праца не была надрукавана.

Даследаванні, прысвечаныя нацыянальным меншасцям БССР, былі прыпынены ў выніку рэпрэсій 1937 года, якія закранулі і навукоўцаў АН БССР. Сярод іх быў шэраг гісторыкаў, якія актыўна займаліся вывучэннем нацыянальных меншасцей БССР: С. Агурскі, Л. Галамшток, С. Матулайціс, В. Скардзіс, К. Шкільтэр і інш. Тым самым шляхам гвалтоўных мерапрыемстваў быў ліквідаваны асяродак навукоўцаў у Беларусі, які займаўся вывучэннем нацыянальных меншасцей.

**Заключэнне.** Даследаванні па гісторыі нацыянальных меншасцей Беларусі канцэнтраваліся ў перыяд 1930-х гадоў у межах нацыянальных навуковых адзінак БАН. Значная ўвага даследчыкамі надавалася вывучэнню эканамічнага становішча і праблеме нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод нацыянальных меншасцей. Акрамя таго існавала спроба асвятлення рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцей, якая не была рэалізавана. Даследаванні закраналі праблему жыцця наступных нацыянальнасцей: латышоў, літоўцаў, палякаў, яўрэяў. Адсутнічалі даследаванні, у якіх нацыянальныя меншасці вывучаліся комплексна. Канец 1930-х гг. стаў часам спынення даследаванняў, прысвечаных адзначанай праблеме. Гэта акалічнасць была звязана з закрыццём навукова-даследчых адзінак, якія займаліся вывучэннем нацыянальных меншасцей і мерапрыемствамі рэпрэсіўнага характару супраць даследчыкаў, якія ў тым ліку займаліся памянёнай праблемай.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Шаўчук, І. І.* З вопыту арганізацыі нацыянальнай навукі БССР / І. І. Шаўчук, Г. У. Карзенка // Этноконфессиональные процессы в истории Беларуси : сб. науч. ст. по итогам науч. конф., Минск, 16 дек. 2016 г. — Минск, 2016. — С. 205—214.
2. *Альховік, М. К.* Беларуская акадэмія навук і нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў 1929—1934 гг. / М. К. Альховік // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси. К 90-летию создания Института бел. культуры : материалы Междунар. науч. конф., Минск , 8—9 дек. 2011 г. — Мінск, 2012. — С. 228—234.
3. Вытворчы плян Беларускай акадэміі навук на 1933 год. — Менск : Выдавецтва БАН, 1933. — 117 с.
4. Вытворчы план акадэміі навук на 1934 год. — Менск : Выдавецтва БАН, 1934. — 88 с.
5. *Шкільтэр, К. Ю.* Латыскія колёніі на Беларусі. Гістарычнае разьвіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак / К. Ю. Шкільтэр. — Менск : Беларус. акад. навук, 1931. — 271 с.
6. *Прынц, Э.* Нацыянальна-культурнае будаўніцтва польскага насельніцтва БССР / Э. Прынц // Бальшавік Беларусі. — 1932. — № 13. — С. 37—50.
7. *Скардзіс, В. І.* Літоўцы ў Совецкай Беларусі : нарыс аб узнікненні літоўскіх пасяленняў на Беларусі, іх становішчы пры царызме і соцыялістычным будаўніцтве пры совецкай уладзе / В. І. Скардзіс. — Менск : Беларус. акад. навук, 1935. — 122 с.
8. Цэнтральны навуковы архіў акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). — Ф. 1. Воп. 1. Спр. 30.
9. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3. Воп. 1. Спр. 34 .


Репозиторий БарГУ